# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

*М. А. МАЖЭЙКА*

## БЕЛАРУСКАЯ ЭКАЛАГІЧНАЯ КУЛЬТУРА Ў ПРАСТОРЫ ДЫЯЛОГА ЗАХОДНЯЙ І ЎСХОДНЯЙ ТРАДЫЦЫЙ

*Аналізуюцца працэсы ўзаемаўплыву ўсходнеславянскай і заходняй традыцый ў экалагічнай культуры. Адзначаецца арганічнае спалучэнне ў беларускай экакультуры як часткі ўсходнеславянскай традыцый Усходу і Захаду, пераважнае захаванне ў ёй традыцыйных архетыпаў антрапапрыроднай гармоніі, якой уласціва сінтэтычная трактоўка адносін чалавека і прыроды.*

Сучасная мадэль гуманнай глабалізацыі грунтуецца на прэзумпцыі неабходнасці культурнай разнастайнасці, абарона якой не толькі вызначана ў якасці галоўнага "інструмента глабалізацыі", але і разглядаецца ў Дэкларацыі ЮНЕСКА "Аб культурнай разнастайнасці" як "этычны імператыў" сучаснасці.

Сітуацыі ўзаемаўплыву заходніх і ўсходніх версій светаўспрымання заўжды адзначаліся высокай крэатыўнасцю, задаючы ў гісторыі культуры новыя тэндэнцыі іх развіцця. Прыкладамі такіх сітуацый могуць служыць узаемаўплыў антычнай і ўсходняй культур падчас паходаў Аляксандра Македонскага, што садзейнічала багаццю і разнастайнасці эліністычнай культуры; узаемадзеянне блізкаўсходняга ірацыяналізму (менавіта – іудзейскага монатэізму) і заходнееўрапейскай рацыянальнасці (менавіта – антычнай філасофіі), якое выступіла культурнай глебай фарміравання хрысціянства; узаемны ўплыў арабскай і еўрапейскай культур падчас маўрытанскага панавання ў Іспаніі, на аснове чаго з'явілася бліскучая андалузская культура, і г.д. У якасці прыкладу, як і мадэлі ўзаемадзеяння традыцый у маштабе *Захад – Усход*, можа быць разгледжана і экалагічная культура ўсходніх славян.

Адным з галоўных момантаў развіцця ўсходнеславянскай экалагічнай культуры выступае тое, што сітуацыя напружанага ўзаемадзеяння далёкіх адна ад адной семантыка-аксіялагічных традыцый з'яўляецца для яе амаль звычайнай. Еўразійскі характар усходнеславянскай культуры задае асаблівы кантэкст яе развіццю: фарміруемая ёю духоўная прастора выступае як свайго роду месца сустрэчы традыцый Усходу і Захаду.

Пры аналізе канкрэтных культурных феноменаў і працэсаў у гэтым кантэксце трэба мець на ўвазе наступныя абставіны.

Па-першае, гаворка ідзе не аб успрыманні заходніх ці ўсходніх светапоглядных узораў. Зазначым, што чым больш багатай, арыгінальнай і разнастайнай з'яўляецца культура, у духоўнай прасторы якой адбываецца кантакт розных культурных традыцый, тым большую талерантнасць здольная яна прадэманстраваць у сутыкненні з каштоўнасцямі, якія здаюцца несумяшчальнымі з яе ўласным духоўным падмуркам.

Па-другое, гаворка ідзе не аб знешніх формах уплыву заходняй ці ўсходняй традыцый на чужую для іх культуру, гэта значыць не аб уключэнні ў яе кантэкст тых ці іншых ідэй і канцэпцый, экзатычных з пункту гледжання яе сутнаснага зместу, якія застаюцца маргінальнымі, хаця і аказваюць на яе развіццё адпаведны ўплыў. А, наадварот, гаворка ідзе аб глыбокай інтэгральнасці ўсходнеславянскай культуры, аб арганічным змястоўным спалучэнні ў яе аксіялагічных падмурках каштоўнасных аспектаў, якія генетычна ўзыходзяць як да заходняй, так і да ўсходняй формаў рацыянальнасці.

Экалагічная культура ўсходніх славян, у прыватнасці беларуская экакультура, можа лічыцца класічным узорам крэатыўнага культурнага сінтэзу, што адбываецца на стыку

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

традыцый Захаду і Усходу. Традыцыі беларускай нацыянальнай культуры, прааналізаваныя з пункту гледжання іх экалагічных арыенціраў, з поўным правам могуць быць ацэнены як экафільныя.

Перш за ўсё гэта звязана з тым, што беларуская экакультура ў значнай ступені захоўвае ў сваіх змястоўных падмурках традыцыйныя архетыпы антрапапрыроднай гармоніі, для якіх характэрная сінтэтычная трактоўка адносін чалавека і прыроды. Істотную ролю ў фарміраванні гэтага экафільнага патэнцыялу адыграла тое, што экалагічная свядомасць беларусаў з’яўляецца вынікам узаемадзеяння фундаментальных каштоўнасцей, генетычна ўзыходзячых да заходняй і ўсходняй традыцый, якія арыентаваны адпаведна на ідэал знешняга прыродаператваральнага актывізму і ідэал унутранай актыўнасці духоўнага самаўдасканалення.

Адзначанае выступае асновай крэатыўнасці гэтага ўзаемадзеяння. Базавыя парадыгмы светапогляду Захаду і Усходу, здавалася б, несумяшчальныя ў семантычных і аксіялагічнах адносінах. Пры ўзаемадзеянні ў духоўнай прасторы беларускай экакультуры, заснаванай на трыдыцыйным ідэале антрапапрыроднай гармоніі, яны даюць унікальны вынік сінтэзу, фарміруючы спецыфічны тып экалагічнай свядомасці.

Адзначаная спецыфічнасць грунтуецца на тым, што ў беларускай экасвядомасці заходняя мадэль адносін да прыроды (мадэль прыродакарыстання) і ўсходняя мадэль (мадэль растварэння ў прыродзе пры адначасовай дыстанцыраванасці ад прыроднай натуральнасці) узаемна здымаюцца ў сінтэтычнай версіі бачання зносін чалавека і прыроднага свету.

Так, з аднаго боку, у беларускай экакультуры, як і ў кожнай культурнай традыцыі Еўропы, афармляецца парадыгма актыўнага прыродакарыстання. Напрыклад, у паэме Янкі Купалы “Адвечная песня” Цень Жыцця на хрэсьбінах абяцае нованароджанаму хлопчыку, што ён будзе цар прыроды, гучыць менавіта гэты пафасны новаеўрапейскі матыў.

Пад уладай сваёй будзе меці
Як ёсць усё чыста на свеце;
Ён будзе ўсіх чыста дужэй,
Ён будзе ўсіх чыста мудрэй.
І рэкі, і долы, і горы
Яго будуць слухаць з пакорай.
І будзе цар гэты навек
Названне насіць – чалавек.

Аднак на самай справе спецыфіку экалагічнай культуры вызначае не факт існавання ці адсутнасці падобных матываў, а іх аксіялагічны статус у культуры, менавіта дамінаванне ці перыферычнасць. Больш таго, заходні актывізм прыродаўладкавання ў кантэксце беларускай экалагічнай культуры, якая захавала ў сваіх змястоўных падмурках традыцыйныя каштоўнасці антрапапрыроднай гармоніі, набывае зусім іншую афарбоўку[1]: акцэнт робіцца на сугучнасці рытмаў жыцця чалавека і прыродных цыклаў. Развіццё і пераасэнсаванне гэтай устаноўкі прыводзяць да таго, што ў беларускай экакультуры складваецца тэндэнцыя трактоўкі прыроды як фундаментальнага фактару чалавечага існавання. У апавяданні Якуба Коласа “Нёманаў дар” дадзеная парадыгма праяўляецца досыць яскрава: Нёман “для сяла быў як родны бацька: і паіў, і карміў, і на сваіх плячах кожнага вынасіў, і кожнага за лета разоў тры ў Коўна і Гродна вазіў, ды яшчэ і на дарогу даваў грошы. <…> Нёман быў нервам сяла, які будзіў яго жыццё і прымушаў чутка прыслухоўвацца да таго, што робіцца навакол. І ўсе важнейшыя справы былі так ці іначай звязаны з Нёманам… Кожны крок Нёмана, кожны спад ці прыбыль вады ў ім не праходзілі незаўважнымі для сялян”.

[1] Так, у ранніх помніках беларускай культуры жыццё прыроды ўспрымаецца як арганічная частка чалавечага лёсу: галоўныя падзеі сялянскага жыцця звязаны з земляробчай працай і таму амаль непасрэдна дэтэрмінаваны прыроднымі з’явамі, якія ва ўмовах ранніх этапаў развіцця агратэхнікі ў пэўным сэнсе станавіліся фактарамі сацыяльных працэсаў. Баркалабаўскі летапіс, напрыклад, апісвае масавыя міграцыі насельніцтва як выкліканыя неўрадлівасцю глебы ці моцнымі халадамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чалавечая прыродапераўтваральная дзейнасць, арганізаваная рытмам сельскагаспадарчага цыкла, разумеецца як арганічна ўпісаная ў прыродны працэс: яна не толькі не парушае яго адвечных заканамернасцей, але і садзейнічае іх ажыццяўленню.

Адна работа за другою
Ідзе-плыве сваёй чаргою
То ў агародзе, то на полі
І не спыняецца ніколі;
І так у клопаце, у рабоце...
Вясна мінецца, прыдзе лета... (Якуб Колас "Новая зямля").

І гэтая злітнасць чалавека з гаспадарчымі, праз іх – з прыроднымі, а праз іх – з касмічнымі працэсамі ацэньваецца ў беларускай экалагічнай культуры як максімальная каштоўнасць:

...Шчасце раю,
Я шчасця большага не знаю,
Ці знаць яго ўжо не прышлося,
Як толькі тут, на сенакосе... (Якуб Колас "Новая зямля").

Такім чынам, сувязь чалавека з прыродным асяроддзем разумеецца ў беларускай экакультуры як глыбокая, не абмежаваная толькі асэнсаваннем практычнай залежнасці чалавека ад прыродных з'яў і працэсаў: непарыўная сувязь з зямлёю, якая ўпарадкоўваецца яго намаганнямі, арганічная ўключанасць у кантэкст прыроднага жыцця і агульныя натуральныя заканамернасці сусвету – усё гэта дае чалавеку ні з чым не параўнальнае пачуццё рэальнасці быцця, адшукання сапраўднага месца пад сонцам і здзяйснення свайго наканавання, што з'яўляецца адвечным падмуркам пачуцця ўласнай годнасці:

...Вецер абдымае
Стан яе дзявочы,
Сонца ёй цалуе
Шыю, твар і вочы.
. . . . . . . . . . . . . . . .
Смела йдзе у сонца,
Уся сама як сонца,
Гэта жнейка наша
Ў нашае старонцы (Янка Купала "Жняя").

У такім кантэксце індустрыялізм, урбаністычны кірунак развіцця грамадства ацэньваюцца не толькі як негатыўныя ў экалагічных адносінах тэндэнцыі ("…Глядзі! Горы паразрыты, / А чыгункай свет абвіты..." ў Францішка Багушэвіча), але і значна болей – як шлях да страты чалавекам сваёй самасці. У вершы "Мяжы" Максім Багдановіч зазначае, што чалавек

... рэйкі пралажыў чыгунак,
Заводаў коміны падняў у выш нябёс,
А сам даўно сляпы ад слёз
І ўжо забыўся аб ратунак.

Фактычна урбаністычнае асяроддзе выступае як зона парушэння касмічных заканамернасцей. Такое ўспрыманне горада носьбітам традыцыйнай экалагічнай свядомасці выразна апісана Якубам Коласам:

Эх, божы люд! Якая сіла
Цябе віхрамі закруціла?
Куды ідзеш, чаго шукаеш?
Які ў сэрцы смутак маеш?
І сам сабе ты чужаніца.
На камяніцы камяніца,
Не згледзець неба край за імі,
І ціснуць сценамі сваімі... ("Новая зямля").

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жыватворны кантакт з прыродай – вось адзінае ратаванне для вырванага з натуральнага кола быцця чалавека індустрыяльнага грамадства:

Цэлы дзень я за брудным сталом
Цэлы дзень скуру цвёрдую скроб,
Стаючы ўкапаным калом,
Я задухай атрутнаю соп.
Навакола чатыры сцяны,
А на іх запляснеўшая столь,
У сабе захавалі яны
Усю крыўду, жаданне і боль.
Вось і вечар... Цяпер я на міг –
На адзін – сваё шчасце знайду,
Кіну-рыну ўсё і ўсіх
Ды у поле я к лесу пайду (Цішка Гартны "Песні гарбара").

Такім чынам, каштоўнасці актывізму прыродаўладкавання, якія ў заходняй культуры абарочваюцца ўстаноўкай на адносіны да прыроды як да крыніцы неабходных для вытворчасці рэчываў і энергіі (парадыгма прыродакарыстання), у кантэксце беларускай экалагічнай культуры асэнсоўваюцца ў іншай, больш мяккай танальнасці: акцэнт робіцца на сугучнасці рытмаў жыцця чалавека і прыродных цыклаў.

Гэтак жа своеасабліва праяўляюцца ў беларускай экалагічнай культуры і тыя ўстаноўкі, што характэрныя для ўсходняга тыпу экалагічнай свядомасці і грунтуюцца на ідэі растварэння чалавечага духу ў касмічнай цэласнасці пры абавязковай адхіленасці ад цялесна-прыроднай натуральнасці. Накладваючыся на традыцыйныя каштоўнасці беларускага асэнсавання прыроды, гэтыя ўстаноўкі набываюць новае гучанне.

Так, беларуская экакультура фарміруе свой ідэал антрапапрыроднай гармоніі, пераасэнсоўваючы і развіваючы на новым падмурку традыцыйную ўстаноўку на ўвасабленне і адухаўленне прыродных з'яў, да якіх чалавек звяртаецца з нязменным спачуваннем:

Хмаркі цёмныя, мае братанькі!
Вецер гоне вас без дарожанькі,
І нідзе ж для вас няма хатанькі…
Адпачынеце аж у Боժанькі! (Францішак Багушэвіч "Хмаркі").

Аднак у беларускай экакультуры не толькі праяўляюцца тыповыя для ўсіх усходнеславянскіх традыцый прынцыпы персаніфікацыі і ўвасаблення стыхій і сіл прыроды, але і развіваецца ідэя глыбіннай сакральнай сувязі паміж станам прыродных працэсаў і станам чалавечай душы. У вершы "Сівер" Янкі Лучыны галоўны герой верша ўсклікае:

Хоць бы раз без цябе зарунець бы палям,
Хоць бы раз у свой час адышла бы зіма!
Ўстрапянуўся бы дух ў чалавечай грудзі ...

Прырода выступае для беларускага селяніна не толькі ў якасці асяроддзя існавання, але і як непасрэдная крыніца яго жыццёвых і духоўных сіл.

У вершы "Прыйдзе вясна" паэт Максім Багдановіч піша:

Сонца прагляне, заселянее
Траўка ў лугу,
Гукне вясна і, як ветрам, развее
Гора-нуду.

Значную ролю ў беларускай экакультуры мела і асэнсаванне сустрэчнага вектара ўзаемадзеяння – вектара, у адпаведнасці з якім душэўнае жыццё чалавека (прычым не толькі духоўнае, але і эмацыянальнае) асэнсоўвалася як фактар жыцця прыроды. Душэўныя рухі і пачуцці чалавека не застаюцца знешнімі для прыродных праяў, знаходзяць у жыцці прыроды водгук. Так, менавіта на струнах драўняных ствалоў грае сваю песню нядолі скрыпач у вершы Францішка Багушэвіча "Смык":

Каб бярозку раз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пацягнуў смыкам,
Яна вечны час
Раўла б з мужыком!..

І як для беларускай экакультуры не ўласцівы жорсткі актывізм заходняй традыцыі, так для яе не характэрная і ўся паўната ўсходняй устаноўкі на безаблічнае растварэнне ў прыродзе: прызначэнне чалавека асэнсоўваецца ў ёй не ў катэгорыях знешняга пераўтварэння прыроды і не ў катэгорыях духоўнага дыстанцыравання ад яе натуральнасці. Чалавек успрымаецца беларускай экакультурай як упарадкавальнік таго сусветнага асяроддзя, у якое ён інтэгральна ўключаны, будучы яго неадрыўнай часткай. У гэтым кантэксце ў беларускай экалагічнай культуры яскрава акрэсліваецца тэма адзінства мікра- і макракосмасу:

Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог,
Улажылі спаць мяне вы на зямлі.
Не курыцца светлы пыл усцяж дарог,
Ў небе месяца праглянуў бледны рог,
Ў небе ціха зоркі расцвілі.
... Бачу я, з прыродай зліўшыся душой,
Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной,
Чую ў цішы, як расце трава (Максім Багдановіч).

Менавіта на гэтым, эмацыянальна афарбаваным падмурку – усведамленні непарыўнага адзінства патаемна-экзістэнцыяльнага ў чалавеку і патаемна-сакральнага ў прыродзе – грунтуецца важная тэма беларускай экакультуры – тэма аховы і захавання жывога. Гэтая традыцыя, атрыбутыўна характэрная для традыцыйнай беларускай культуры, была асэнсавана яшчэ ў эпоху Адраджэння. Так, ужо ў паэме Міколы Гусоўскага "Песня пра зубра", змест якой грунтуецца на шматграннай гуманістычна-рэнесанснай філасофскай праграме гарманічных узаемадачыненняў чалавека, грамадства і прыроды, зазначана: "Звычай тысячагадовы такі ў народа вядзецца… Даўні парадак – нязменна ахоўваць багацці зямныя".

Для беларускай мастацкай культуры характэрныя творы, прасякнутыя пантэістычным пафасам, якія заклікаюць да чалавечага спачування ад імя шчымліва безабароннай і параненай чалавекам, знявечанай прыроды:

Плакала бяроза ды гаварыла:
"Ці ж у вас на гэта я заслужыла,
Што б вы мяне парубалі
І кроў маю пасасалі?
Я вам пры дарозе, як дзяўчо, стаю...
За што ж вы сячэце мяне без віны?.." (Ян Чачот).

Больш за тое, ад відавочных экафільных матываў беларуская экакультура ўздымаецца да агульнафіласофскага асэнсавання праблемы *чалавек – прырода*, фарміруючы фундаментальны светапоглядны ідэал антрапасацыяпрыроднай гармоніі, у межах якога каштоўнасці экалагічнага плана самым цесным чынам злучаюцца з сацыякультурнымі каштоўнасцямі плана этнанацыянальнага. У гэтым кантэксце асаблівы сэнс набывае тэма "сваёй зямлі", артыкуляваная ў беларускай экалагічнай культуры як ў канкрэтна-асабістым, так і ў агульнанацыянальным планах.

Беларуская экалагічная культура захоўвае базавыя традыцыйныя архетыпы бачання адносін чалавека і прыроды, якія характэрныя для аграрных культур і знаходзяць сваё праяўленне ў хтанічным гілазаізме свядомасці. Для Францішка Багушэвіча беларусы – "дзеткі Маці-Зямлі нашай". Зямля выступае як Маці – стваральніца жыцця, як жыватворная крыніца чалавечага быцця і гарант яго гармоніі з сусветам. Не выпадкова ў паэме "Новая зямля" Якуба Коласа гучыць такі зварот да зямлі:

Дзень добры, новая мясціна!
Спаткай ты нас, як маці сына ...
Узброй надзеямі нам грудзі,
Бо мы твае, зямелька, людзі!

Зямля, праца на ёй пераасэнсоўваюцца беларускай экасвядомасцю ў катэгорыях эмацыянальна-асабістага і нават інтымнага планаў успрымання такога феномена, як *зямля*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яна выступае ў беларускай экалагічнай традыцыі не проста галоўнай, але абсалютнай каштоўнасцю. Менавіта аб ёй гаворыць чалавек у самыя патаемныя імгненні свайго жыцця; напрыклад, перад смерцю Міхал у паэме Якуба Коласа "Новая зямля", Васіль Дзяцел, размаўляючы, з каханай, у "Палескай хроніцы" Івана Мележа. У Максіма Багдановіча чытаем:

Як Базыль у паходзе канаў,
Ўсё старонку сваю спамінаў.
– Вы прашчайце, прашчайце, шнуры,
Вы прашчайце, негараныя!
Мне вас болі ўжо не гараць,
Буйным збожжам на зары не засяваць.

У беларускай паэзіі распаўсюджаны матыў таго, як нават жменька роднае зямлі, як святы ахоўнік, ратуе беларуса на чужой старане.

Умёрх бы то, мусіць, я тут,
Каб не жменька той роднай зямлі…
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
А другім што даваў, дык і не!
Не памог і не шкодзіў нікому,
Бо зямля не па іх, а па мне.

Значыць, трэба зямлі мець аж з дому, – чытаем у Францішка Багушэвіча.

Увогуле, зямля для беларуса не проста асяроддзе пражывання, яна – своеасаблівы субстрат быцця:

...То – наймацнейшая аснова
І жыцця першая умова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей сваіх не кіне... (Якуб Колас "Новая зямля").

Такім чынам, у беларускай экалагічнай культуры пераасэнсоўваецца захаваная ў яе архетыпах традыцыйная тэндэнцыя сакралізацыі зямлі – тэндэнцыя, якая праяўляецца ў атаясамліванні селянінам сябе з гэтым сакральным пачаткам. Для беларускай экалагічнай свядомасці характэрна ўспрыманне канкрэтнага прыроднага асяроддзя жыцця індывіда як асобай, інтымна значнай для чалавека мікраландшафтнай зоны (менавіта "свая" зямля), якая залежыць у сваёй эвалюцыі ад яго намаганняў, як знешне практычных, так і ўнутрана душэўных. Менавіта гэтым тлумачыцца спрадвечнае імкненне селяніна да набыцця сваёй зямлі, якое становіцца аксіялагічнай дамінантай сялянскага менталітэту. "Купіць зямлю, прыдбаць свой кут ..." – так лапідарна выказвае гэта матывацыйна-светапоглядное credo Якуб Колас.

Гаворка ў дадзеным выпадку ідзе не толькі і не столькі аб набыцці плошчы для пасеваў, колькі аб набыцці менавіта свайго *надзелу* як *долі* ва ўсёй шматсемантычнасці гэтага беларускага слова: і як вызначэння свайго месца ў свеце, што дае магчымасць прымаць *удзел* (як неадрыўнай *долі, часткі*) у яго сакральным руху, і як шчаслівай (менавіта па прычыне гэтага) *долі*, шчаслівага лёсу.

Змест мастацкіх тэкстаў беларускай літаратуры сведчыць аб тым, што для яе характэрна каштоўнасная ўстаноўка, якая можа быць абазначана як свайго роду *сіндром Антэя*: расстанне з роднай зямлёй успрымаецца як выпадзенне з сусветнай гармоніі, якое па-антэеўску небяспечна і робіць чалавека безабаронным:

...О, край мой мілы! Усёй душою
Хачу злучыцца я з табою,
У тваіх палях пазычыць сілу... (Якуб Колас. "Новая зямля").

У найбольш выразнай форме гэта светапоглядная парадыгма праяўляецца ў вершах Максіма Багдановіча:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паломаны жыццём, чакаючы магілы,
Радзімая зямля, прынікнуў я к табе,
І бодрасць ты ўліла ў слабеючыя жылы,
Зварушыла маёй душы драмаўшай сілы,
І месца ў ёй з тых пор няма ўжо больш жальбе.

У беларускай экалагічнай свядомасці непарыўна знітаваны прыродныя, эстэтычныя, маральныя, рэлігійныя і іншыя аксіялагічныя структуры. Надзвычай выразным у гэтым сэнсе з'яўляецца сюжэт Францішка Багушэвіча аб тым, як сяляне, якіх гвалтоўна прымушалі прыняць уніяцкую веру, аддаюць перавагу не чужому храму, а роднаму лесу, ведучы размову з Богам у пушчы:

Кожны ў нядзелю раненька ўстане
І марш у лясы.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
А там, у пушчы, гдзе-кольвек збяруцца,
Чытаюць малітвы і плачуць шчэра;
Скончаць маліцца і разыдуцца,
Вось і ўся была тут вера ("Свая зямля").

Прырода трактуецца ў беларускай экакультуры не як абстрактнае асяроддзе, не толькі прыгожая ў сваіх розных праявах магутная і велічная стыхія, але і Богам дадзены багаты дарунак, і ўспрынятая ад продкаў спадчына. Яе разам з культурай і мовай належыць захоўваць, бо без яе немагчыма ні асабістая, ні этнічная самаідэнтыфікацыя. Інакш кажучы, родная зямля разумеецца ў беларускай экалагічнай культуры не толькі як нацыянальны здабытак, але як нацыянальная святыня. Зямля – "аснова ўсёй айчыне", з ёй звязана надзея на вызваленне "з няволі цяжкай", зямля – "промень волі і свабоды". Гэтыя словы Якуба Коласа могуць служыць афарыстычным выказваннем арыентацыі беларускай экакультуры на сінтэз сацыяпрыродных і сацыякультурных каштоўнасцей.

Такім чынам, спецыфіка беларускай экасвядомасці заключаецца ў тым, што, будучы заснаванай на інтэгральным успрыманні чалавекам сябе і свайго прыроднага асяроддзя, яна не механічна спалучае каштоўнасці заходняй і ўсходняй экалагічных культур, а ажыццяўляе іх арганічны сінтэз.

У гэтым кантэксце чалавек асэнсоўвае сябе не ў якасці таго, хто стаіць *над* прыродай як яе ўладар і гаспадар, і не ў якасці вылучанага з яе носьбіта духу (і ў першым, і ў другім выпадку чалавек апыняецца *па-за* прыродай), але ў якасці таго, хто ўпарадкоўвае прыроду сваімі намаганнямі і з'яўляецца неад'емнай часткай сусветнага цэлага.

_______________

*1. О культурном* разнообразии // [Электронный ресурс]: декларация ЮНЕСКО. – Режим доступа: *http: //www.peace.ru/tolerance/news/cul-div.htm.*

*2. Экологическая* мысль восточных славян: антология / ред.-сост. М. А. Можейко. – Мн.: Красико-принт, 1995. – 795 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ